Дзяніс ДУК

# ПОЛАЦК IX—XI СТАГОДДЗЯЎ:

## шлях да дзяржаўнасці

*Як і чаму старажытнае гарадзішча на рацэ Палата зрабілася сталіцай магутнай сярэдневяковай дзяржавы — Полацкага княства? Што гэтаму садзейнічала і як гэта адбывалася? На гэтыя пытанні і адказвае аўтар.*

Полацк — самы старажытны беларускі горад, сталіца першай дзяржавы на нашых землях. Заснаванне Полацка як дзяржаўнага цэнтра, развіццё гістарычнай тапаграфіі горада і яго сакральнай прасторы — усё гэта актуальныя пытанні айчыннай гістарыяграфіі. Сёлета святкуецца 1150-гадовы юбілей горада. Аднак ці так усё ясна з першапачатковай датай летапіснага ўпамінання Полацка? Ці не з'яўляецца горад старэйшым, ці наадварот, маладзейшым за адмераныя летапісам 1150 гадоў? Сёння для гісторыкаў зразумела, што многія пачатковыя летапісныя даты існавання гарадоў на Русі не з'яўляюцца дакладнымі і патрабуюць навуковай верыфікацыі.

### Заснаванне Полацка

Варта адзначыць тое, што ў адносінах да Полацка археолагі доўгі час не маглі пераканаўча давесці ці паставіць пад сумненне сам факт яго існавання ў IX стагоддзі. Ды і што лічыць горадам? "Град", які згаданы ў летапісах пад 862 годам, яшчэ не з'яўляўся горадам у сацыяльна-эканамічным, гэта значыць вызначаным у гістарыяграфіі разуменні паняцця "горад". Горад — гэта ў першую чаргу месца канцэнтрацыі рамёстваў і гандлю, насельніцтва з развітай гарадской інфраструктурай, культавымі і свецкімі асяродкамі грамадскага жыцця, адметным ад сельскага ладам жыцця. Ці быў такім пасяленнем Полацк у тыя далёкія часы? Безумоўна, не. Аднак мы ўсё ж праводзім адлік пачатку гісторыі Полацка з 862 года. У той час гэта быў "град" — умацаванае пасяленне, якое ў далейшым стала сталіцай Полацкага княства, славутым Полацкам, якім мы яго ведаем у гісторыі нашай Бацькаўшчыны.

Археолагі пераканаўча даказалі, што першыя людзі на полацкім гарадзішчы жылі па меншай меры з рубяжа старой і новай эр, а магчыма — з сярэдзіны I тысячагоддзя да нашай эры[1]. Хто яны былі? Ці можна лічыць іх заснавальнікамі Полацка? На гэтае пытанне сёння можна даць адказ. Першыя людзі, якія пасяліліся на полацкім гарадзішчы, гаварылі на балцкіх мовах. Менавіта яны і далі гораду імя ад назвы ракі Палата, што азначае ў балцкіх мовах "балота", "нізіна", "лужа".

Ці не вынікае з гэтага, што Полацк можа святкаваць двух ці нават двух з паловай тысячагоддзе? Мы можам адказаць "не", патлумачыўшы гэта некалькімі прычынамі. Па-першае, полацкае гарадзішча жалез-



***ДУК Дзяніс Уладзіміравіч.***

*Загадчык кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1977 г. у Наваполацку. У 1999 г. закончыў гістарычна-філалагічны факультэт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Займаецца археалогіяй і гісторыяй Полаччыны IX—XVIII стст. Аўтар манаграфій "Полацк XVI—XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада" (Наваполацк, 2007), "Полацк і палачане (IX—XVIII стст.)" (Наваполацк, 2010), вучэбна-метадычных комплексаў "Гісторыя Полацка: па матэрыялах археалагічных даследаванняў" (Наваполацк, 2006), "Археалогія" (Наваполацк, 2009) і больш за 100 навуковых публікацый.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Від полацкага гарадзішча з паўночнага боку.* 2007 г.



нага веку* было звычайным радавым пасяленнем, якіх у ваколіцах Полацка было шмат. Ніводнае з іх, акрамя полацкага, не развівалася ў сярэдневяковы горад. Па-другое, пачатковым насельніцтвам полацкага гарадзішча былі балты днепра-дзвінскай археалагічнай культуры, далёкія продкі сучасных літоўцаў і латышоў. Балты не засноўвалі гарадоў і дзяржаў, бо балцкае насельніцтва ў гэты час і да Позняга Сярэдневякоўя жыло ва ўмовах рода-племяннога ладу.

Пасля спынення існавання днепра-дзвінскай культуры ў V—VI стагоддзях гарадзішча засяляюць носьбіты іншай балцкай культуры тыпу Банцараўшчыны-Тушамлі. Новае насельніцтва пасялілася на гарадзішчы і на селішчы каля яго падножжа. Селішча размясцілася на поўдзень ад гарадзішча, уздоўж левага берага Палаты[2]. У VI стагоддзі плошча даславянскага Полацка складала каля 8 га.

У другой палове VIII стагоддзя на тэрыторыі Верхняга Падзвіння з'яўляюцца групы перасяленцаў, якія размаўлялі на славянскіх мовах. Адна з родавых груп славян-мігрантаў абрала месцам свайго пасялення гарадзішча. Археолагі змаглі вызначыць час засялення славянамі полацкага гарадзішча — гэта адбылося не пазней за 780 год[3], ці, магчыма, на дзесяцьдваццаць гадоў раней. Акрамя гарадзішча славяне пасяліліся на селішчах каля яго падножжа. Пройдзе яшчэ шмат гадоў, і пасяленне, заснаванае славянамі як рэгіянальны адміністрацыйны цэнтр, стане сталіцай магутнай дзяржавы — Полацкага княства.

Славянскае насельніцтва культуры смаленскаполацкіх доўгіх курганоў (летапісных крывічоў) з'яўляецца заснавальнікам летапіснага "града" Полацка племяннай эпохі "да Рагвалода". Гэтае насельніцтва пераняло балцкую назву горада і пасялілася на месцы старажытных гарадзішча і паселішча. Падчас археалагічных раскопак на гарадзішчы былі знойдзены сярэбраныя манеты Арабскага халіфата — куфічныя дырхемы, якія былі адчаканены не пазней за 818 год і трапілі ў Полацк у 820—840-я гады[4].

Верагодна, узаемаадносіны новага, прышлага насельніцтва і аўтахтонаў (карэнных жыхароў) былі мірныя, паколькі падчас археалагічных даследаванняў полацкага гарадзішча і селішчаў** слядоў ваенных канфліктаў не выяўлена.

Новае насельніцтва — полацкія крывічы — разам з іншымі плямёнамі, пасяленцамі Рускай даліны, у 862 годзе ўдзельнічалі ў запрашэнні варажскага князя Рурыка княжыць на Русі. Рурык сеў княжыць у Ноўгарадзе, а яго братам Сіневусу і Трувару былі дадзены гарады Ізборск і Белавозера. Праз два гады пасля смерці братоў Рурык становіцца адзінаначальным правіцелем Русі і раздае "грады" сваім васалам-баярам. Аднаму з іх быў дадзены Полацк. Гэта падзея адбылася ў 864 годзе[5]. Так, згодна летапісам пачалася гісторыя Полацкага княства.

Такім чынам, адказаць на пытанне аб узросце летапіснага Полацка можна так. Хрэстаматыйная дата першага ўпамінання Полацка пад 862 годам не супярэчыць археалагічным даным. У 862 годзе кры-

* Першапачатковае пасяленне было размешчана на гарадзішчы плошчай каля 2 га. Гарадзішча размешчана на аддаленасці 0,8 км ад вусця ракі Палата, на яе левым беразе. У 1563 годзе русла Палаты было зменена і з тых часоў гарадзішча размешчана ўжо на правым беразе Палаты. Вышыня пагорка складае каля 14 м, сёння плошча помніка складае 0,8 га.

** Акрамя асноўнага паселішча славяне заснавалі яшчэ два.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

віча-палачане разам з іншымі плямёнамі запрасілі Рурыка на княжанне. Першая летапісная згадка ўласна Полацка адносіцца да 864 года, калі Рурык раздаваў гарады сваім васалам: *"...овому Полотеск, овому Ростов, другому Белоозеро..."*. Ні Рурык, ні яго васал не заснавалі, а паводле летапіснага адпаведніка не "зрубілі" Полацк, паколькі славяне (крывічы-палачане) пражывалі на месцы Полацка не менш за 80 гадоў да таго, як адбыліся згаданыя падзеі. Летапісная дата існавання славянскага "града" Полацка ў 862—864 гадах цалкам пацверджана археалагічнымі данымі, і гэта з'яўляецца самым важным дасягненнем сучаснай полацкай археалогіі. Што тычыцца больш ранніх дат, то спашлёмся на вопыт святкавання юбілеяў іншых старажытных гарадоў Русі — Кіева і Старай Ладагі. У гэтых гарадах побач з летапіснымі датамі існавання пачатковых "градаў" прызнаюцца і больш раннія даты, пацверджаныя археалагічнымі даследаваннямі. А значыць, маюцца дадатковыя падставы для святкавання новых юбілеяў Полацка.

## Станаўленне горада

Пераўтварэнне Полацка ў развіты сацыяльна-эканамічны цэнтр, уласна горад, яскрава прасочваецца па археалагічных даных. У X стагоддзі на полацкім селішчы пачалі актыўна развівацца розныя рамёствы, сляды існавання якіх выяўлены археолагамі. У прыватнасці, былі вывучаны сляды ювелірнай майстэрні, рэшткі старажытных падвор'яў, якія мелі зрубныя дамы слупавой канструкцыі і гаспадарчыя пабудовы (стайні, хлявы, амбары)[6]. Насельніцтву пачатковага Полацка, якое пастаянна расло, ужо не хапала месца на селішчы, і палачане засноўвалі невялікія селішчы на правым беразе Палаты. Адно з іх, якое даследавалі археолагі, мела плошчу каля 0,24 га. Ёсць археалагічныя сведчанні аб існаванні яшчэ аднаго такога селішча на правым беразе Палаты.

Такім чынам, да канца X стагоддзя былі створаны перадумовы для перарастання летапіснага "града" ў раннегарадскую структуру. На месцы асноўнага селішча ўтвараецца вакольны горад Полацка, які быў умацаваны драўлянай сцяной з вежамі і гароднямі (зрубнымі памяшканнямі для воінаў і складамі ўзбраення). Гэтая драўляная сцяна была пабудавана на невысокім валу, падмурак якога быў умацаваны камянямі-валунамі. Дарэчы, скандынаўская сага аб Тыдрыку Бернскім узгадвае каменныя сцены старажытнага Полацка[7].

Разам з вакольным горадам археолагі зафіксавалі ўмацаванні полацкага гарадзішча. Пачатковы вал, які быў насыпаны напрыканцы X стагоддзя, не раз падсыпаўся, і ў выніку гарадзішча стала добра ўмацаваным цэнтрам, дзядзінцам Полацка[8]. На гарадзішчы пражывалі князь з дружынай, тут знаходзіліся сядзібы рамеснікаў — збройнікаў і ювеліраў[9]. Дынамічнае развіццё рамёстваў, умацаванне ролі гандлю прывяло да канца X стагоддзя да паступовага асваення палачанамі новых тэрыторый. У першай палове XI стагоддзя на поўдзень ад вакольнага горада былі размешчаны ворыўныя палі. А ў другой палове XI стагоддзя тут утварыўся буйнейшы полацкі пасад пад назвай "Вялікі". Напрыканцы X стагоддзя пачынаюць фарміравацца пасады за Палатой (Запалоцкі) і Слабадскі на левым беразе Заходняй Дзвіны[10]. У выніку развіцця пасадаў у другой палове XI стагоддзя плошча Полацка павялічылася больш чым у дваццаць разоў і дасягнула 180 гектараў.

Важным элементам сацыя-тапаграфічнай структуры старажытнага горада з'яўляліся некропалі. Да прыняцця хрысціянства насельніцтва Полацка хавала памерлых у курганных могільніках. Полацк X стагоддзя быў акружаны дзвюма вялікімі курганнымі групамі — усходняй і паўночнай. Плошча кожнай з іх была вялікай і магла дасягаць 50 га[11].

Паўночны курганны некропаль займаў тэрыторыю ад Запалоцкага пасада да будучага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ўздоўж правага берага Палаты. Час, калі ён быў разбураны, невядомы, хутчэй за ўсё гэта адбылося ў XVII стагоддзі. Усходні курганны могільнік захаваўся да канца XVIII стагоддзя. Курганы гэтага некропаля ў пісьмовых крыніцах XVII—XVIII стагоддзяў называліся "валатоўкамі" і "горамі Балгарэйскімі". У такіх курганах маглі быць пахаваны і дружыннікі з бліжэйшага княжацкага асяроддзя. Доказам гэтага з'яўляецца археалагічная знаходка жалезнага мяча X стагоддзя.

У канцы X стагоддзя ў Полацку з'явілася першая хрысціянская абшчына. Паводле скандынаўскай сагі, ісландскі місіянер Торвальд Вандроўнік заснаваў старажытнейшы полацкі манастыр св. Іаана Прадцечы на Востраве, размешчаным на Дзвіне. Такім чынам, Полацк як горад у сацыяльна-эканамічным разуменні гэтага тэрміну склаўся ў сярэдзіне XI стагоддзя. У той час Полацк стаў і буйнейшым духоўна-рэлігійным і культурным цэнтрам Полацкай зямлі.

## Полацкая Сафія — сімвал дзяржавы

Адна з яскравых прыкмет горада — гэта наяўнасць культавых пабудоў, у першую чаргу мураваных цэркваў. Як вядома, Полацк з'яўляецца адным з трох гарадоў Русі (разам з Кіевам і Ноўгарадам), аб'яднаных у так званую "сафійную прастору". Сафійскія саборы, пабудаваныя ў гэтых гарадах, падкрэслівалі не толькі сакральнасць гарадскіх цэнтраў, але ўвасаблялі ідэалогію і веліч дзяржавы. Гэтую ролю выконваў і Полацкі Сафійскі сабор. Нельга не звярнуць увагі на праблему храналогіі яго будаўніцтва. У адрозненне ад Сафійскіх сабораў у Кіеве і Ноўгарадзе, час узвядзення Полацкага Сафійскага сабора нельга вызначыць па пісьмовых крыніцах.

Полацкі Сафійскі сабор упершыню згадваецца ў апісанні рускіх гарадоў "дальніх і бліжніх" (не раней за 1387 г. — не пазней за 1406 г.): *"Полтескъ на Двине и на Полоте, древянъ, святая София камена о седми връсехъ"*[12]. Да эпохі Усяслава Брачыславіча належыць згадка сабора ў "Слове аб палку Ігаравым". Згадваецца сабор у актавых дакументах XV—



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



*Беларускія археолагі В.Кошман, М.Плавінскі, С.Дзярновіч, Д.Дук, Г.Штыхаў (злева направа) на полацкім гарадзішчы.* 2007 г. Фота М.Гальпяровіча.

XVIII стагоддзяў, адлюстраваны на чарцяжах і іканаграфічных крыніцах XVI—XVIII стагоддзяў[13].

Час узвядзення Сафійскага сабора шырока датуецца ў межах пачатковага перыяду княжання Усяслава Брачыславіча (1044—1066 гг.). Прымаючы гэтыя даты як безумоўныя, мы задаём сабе пытанне: якім чынам малады князь мог ажыццявіць грандыёзнае па тагачасных маштабах, геапалітычных амбіцыях і эканамічных затратах будаўніцтва сабора? Распрацоўка больш вузкай, уласна археалагічнай храналогіі ўскладняецца адсутнасцю дэталёвага вывучэння ранніх культурных напластаванняў каля Сафійскага сабора, дакладных абмерных планаў, зробленых пры дапамозе сучасных тэхналогій, а таксама даных па асаблівасцях фармоўкі плінфы пачатковага сабора.

Аўтарытэтны даследчык старажытнага беларускага дойлідства І.М.Хозераў адзначаў, што час завяршэння будаўніцтва сабора раней сярэдзіны XI стагоддзя больш лагічна ўспрымаецца ў аспекце гістарычных фактаў і падзей, чым недастаткова абгрунтаваная дата 1044—1066 гг.[14]. Развіваючы думку І.М.Хозерава, археолаг і гісторык С.В.Тарасаў асцярожна дапускае магчымасць пачатку будаўніцтва сабора пры Брачыславе Ізяславічы (1003—1044 гг.) — пасля 1021 года.

Неабходна адзначыць, што найбольш поўнае археалагічнае вывучэнне Сафійскага сабора было праведзена ў 1975—1980 гадах Валянцінам Булкіным. Параўнанне тэхналогіі закладкі і глыбіні падмуркавых равоў нясучых сцен і іншых лентачных падмуркаў дало магчымасць даследчыку вызначыць, што па гэтых паказчыках Полацкі Сафійскі сабор бліжэй за ўсё да кіеўскіх цэркваў першай паловы — сярэдзіны XI стагоддзя[15]. Такім чынам, меркаванне І.М.Хозерава аб магчымасці ўзвядзення сабора да сярэдзіны XI стагоддзя (раней за хрэстаматыйную дату 1044—1066 гг.) знайшло археалагічнае пацвярджэнне.

Лічым магчымым правесці гістарычныя паралелі паміж праўленнямі македонскіх цара Філіпа і яго сына Аляксандра Македонскага з полацкімі князямі Брачыславам Ізяславічам і яго сынам Усяславам. У абодвух выпадках асновы эканамічнага і палітычнага росквіту абедзвюх дзяржаў былі закладзены бацькамі-заснавальнікамі напярэдадні вялікіх здзяйсненняў іх сыноў. Пры Брачыславе Ізяславічу Полацкае княства атрымала выхад да Балтыйскага мора, былі заснаваны падзвінскія гарады-фарпосты Герцыке і Кукенойс, сістэма крэпасцей вакол Браслава, а ў выніку паходу Брачыслава ў 1021 годзе на Ноўгарад у склад Полацкай зямлі ўвайшлі гарады Віцебск і Усвяты з валасцямі. Пасля 1021 года Брачыслаў знаходзіўся на вяршыні палітычнай і эканамічнай магутнасці і мог арганізаваць і рэалізаваць задуму па будаўніцтву Сафійскага сабора. Яго сын Усяслаў Брачыславіч (полацкі князь у 1044—1101 гадах) мог давяршыць справу бацькі па аздабленню сабора. Ён захапіў Ноўгарад і вывез з Наўгародскай Сафіі царкоўнае начынне, якое прызначыў для Полацкай Сафіі.

## Полацк — сталіца княства

Не менш важная даследчыцкая праблема заключаецца ў раскрыцці механізму ўтварэння Полацкага княства. Адным з асноўных тут з'яўляецца пытанне аб тым, чаму менавіта Полацк зрабіўся стольным "градам" зямлі-валасці. Неабходна адзначыць, што

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дзяржаватворчыя працэсы на тэрыторыі Беларусі развіваліся ў цеснай сувязі з этнічнымі. У якасці красамоўнага прыкладу прывядзём пачатковую гісторыю Тураўскай зямлі. Тураўскае княства склалася на землях дрыгавічоў, буйнога ўсходнеславянскага племені, якое ўтварылася на аснове больш ранніх славянскіх культур. Адной з іх з'яўлялася пражская археалагічная культура. Яе насельніцтва жыло на правабярэжжы Прыпяці як мінімум з V стагоддзя. Аднак ранняя прысутнасць славян у рэгіёне ніяк не паскорыла працэс дзяржаваўтварэння. Легендарны князь Тур, паводле летапісаў, княжыў напрыканцы X стагоддзя, а ў пачатку XI стагоддзя ў Тураве сеў княжыць Святаполк Уладзіміравіч, які слушна лічыцца першым тураўскім князем. Існаванне раннегарадскіх напластаванняў XI стагоддзя ў Тураве цалкам пацвярджаецца археалагічнымі данымі[16].

Большая частка балтаў на тэрыторыі Верхняга Падзвіння была асімілявана славянамі, якія падчас рассялення ў другой палове VIII стагоддзя ўзялі пад кантроль землі, населеныя балтамі. Каб жыць у згодзе з балцкім насельніцтвам, славянам неабходна было ствараць уласныя органы ўлады. Славяне з'явіліся на тэрыторыі Падзвіння адносна позна і гэта абумовіла інтэнсіфікацыю дзяржаватворчых працэсаў.

На ролю стольнага града крывічоў-палачан, акрамя Полацка, маглі прэтэндаваць Віцебск і Лукомль. Пры гэтым паміж Полацкам і Віцебскам маюцца найбольш агульныя рысы ў гістарычнай тапаграфіі і асаблівасцях стратыграфіі культурных напластаванняў. Абодва гарады даволі добра вывучаны археолагамі[17].

У IX стагоддзі Віцебск з'яўляўся рэгіянальным адміністрацыйным цэнтрам падзвінскіх крывічоў, такім жа, як і Полацк. З гэтага паўстае пытанне: па якой прычыне васал Рурыка сеў на княжанне менавіта ў Полацку? Відавочна, што ніякіх істотных пераваг у арганізацыі гандлю і гаспадарчага развіцця паміж двума адміністрацыйнымі цэнтрамі не было. Аднак палітычная роля Віцебска ў IX—X стагоддзях адносна Полацка была другараднай. На першы погляд, з'яўленне князя ў 864 годзе менавіта ў Полацку можна патлумачыць выпадковасцю. Аднак такая выпадковасць у працэсе станаўлення дзяржаўнасці на беларускіх землях наўрад ці мела месца. У Полацка ўсё ж была адна немалаважная перавага перад іншымі славянскімі паселішчамі Верхняга Падзвіння — ён быў размешчаны бліжэй да балта-славянскай мяжы. Гэтая мяжа гістарычна склалася падчас рассялення носьбітаў культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў і праходзіла на адлегласці да 100 кіламетраў на захад і паўночны захад ад Полацка. Заходні напрамак славянскай (крывіцкай) дзяржаўнай экспансіі добра прасочваецца па заснаванню ў XI стагоддзі парубежных крэпасцей і фарпостаў, такіх як Браслаў, Рацюнкі, Маскавічы, Герцыке, Кукенойс і інш.

Традыцыйна заснаванне Віцебска звязваецца з дзейнасцю княгіні Вольгі, якая каля 947 года заснавала пагост на Замкавай гары Віцебска. Такім чынам, гэтыя землі сталі спадчынай кіеўскіх князёў і не мелі адносін да Полацкай воласці. Віцебск увайшоў у склад Полацкай зямлі ў 1021 годзе.

Такім чынам, у IX стагоддзі этнічнае пытанне было адным з асноўных у працэсе станаўлення дзяржаўнасці Полацкай зямлі. Зручнае размяшчэнне Полацка непадалёк ад мяжы з балцкім этнічным масівам абумовіла яго палітычнае і, як следства, сацыяльна-эканамічнае лідарства ў рэгіёне. У выніку дзяржаватворчых працэсаў Полацк стаў палітычным, і, як следства, сацыяльна-эканамічным цэнтрам рэгіёна. Дзякуючы культурнай і эканамічнай экспансіі ў Ніжняе Падзвінне Полацкая зямля атрымала магчымасць весці разгалінаваны міжнародны гандаль і атрымоўваць значныя прыбыткі з падуладных балцкіх земель.

---

[1] Дук Д.У. Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Вып. 21. Мн., 2011. С. 30—60.

[2] Тарасаў С.В. Полацк IX—XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія. Мн., 1998. С. 26.

[3] Дук Д. Старажытныя славяне полацкага гарадзішча (780—1310 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. 2008, № 7. С. 21—27.

[4] Клімаў М.В. Новае адкрыццё ў храналогіі старажытнага Полацка // Беларускі гістарычны часопіс. 2010, № 5. С. 5—7.

[5] Полное собрание русских летописей (далей — ПСРЛ). Лаврентьевская летопись. Т. 1. М., 1997. Стб. 20.

[6] Дук Д.У. Полацк і палачане (IX — XVIII стст.). Наваполацк, 2010. С. 61—64.

[7] Там жа. С. 43; Дук Д., Тарасаў С. Да пытання тапаграфічнага развіцця Вялікага пасада Полацка ў XI ст. // Гістарычна-археалагічны зборнік. 2005, № 20. С. 163—168.

[8] Штыхов Г.В. Древний Полоцк (IX—XIII вв.). Мн., 1975. С. 24—25.

[9] Дук Д.У. Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы. С. 30—60.

[10] Дук Д.У. Полацк і палачане (IX—XVIII стст.). С. 133.

[11] Дук Д., Плавінскі М. Аб полацкім некропалі X—XIII стст. // Гістарычна-археалагічны зборнік. 2006, № 22. С. 173—186.

[12] ПСРЛ. Т. 7. Летопись по Воскресенскому списку. СПб., 1856. С. 240.

[13] Штыхов Г.В. Древний Полоцк (IX — XIII вв.). С. 117; Селицкий А.А. Живопись Полоцкой земли XI—XII вв. Мн., 1992. С. 18—21.

[14] Хозеров И.М. Белорусское и смоленское зодчество XI—XIII вв. Мн., 1994. С. 29.

[15] Булкин В.А. Полоцкий Софийский собор в XI веке // Гістарычна-археалагічны зборнік. 2000, № 15. С. 135.

[16] Лысенко П.Ф. Туровская земля IX—XIII вв. Мн., 1999.

[17] Левко О.Н. Витебск. Мн., 2010; Штыхов Г.В. Города Полоцкой земли (IX — XIII вв.). Мн., 1978.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова